Источник: "Веды" - 2015-04-22

# "Я – СЫН ТВОЙ, МАЦІ-БЕЛАРУСЬ..."

**23 красавіка а 14-й гадзіне ў чытальнай зале рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа (ЦНБ) НАН Беларусі адкрыецца выстава «Я – сын твой, маці-Беларусь...» (да 115-годдзя з дня нараджэння Г.І.Гарэцкага).**



Аснову экспазіцыі, якая адлюстроўвае сферу навуковых і грамадскіх інтарэсаў Г.Гарэцкага **(на фота злева з Ул.Дубоўкам)**, складаюць дакументы з асабістага архіва і кнігазбору акадэміка, што захоўваюцца ў ЦНБ НАН Беларусі. Выстава дае наведвальнікам магчымасць прасачыць асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху славутага суайчынніка. На ёй можна будзе ўбачыць дакументы, якія адносяцца да часоў яго дзейнасці на Беларусі ў канцы 1910-х і ў 1920-я гады.

Шырока прадстаўлены экспанаты, што сведчаць аб працы Г.Гарэцкага ў складзе розных інжынерна-геалагічных арганізацый СССР і пра яго ўдзел у будаўніцтве буйных гідратэхнічных збудаванняў краіны.

Не застанецца па-за ўвагай дзейнасць вучонага ў Акадэміі навук БССР на пасадзе загадчыка лабараторыі геалогіі і палеапатамалогіі антрапагену Інстытута геахіміі і геафізікі.

У экспазіцыі шырока выкарыстаны фотаздымкі розных гадоў. Многія з іх сведчаць аб значных падзеях з жыцця юбіляра. Г.Гарэцкі паўстае на фота разам з роднымі і блізкімі, побач з вядомымі дзеячамі навукі і культуры. Выклікае цікавасць і эпісталярная частка выставы, якая складаецца з перапіскі вучонага з дзеячамі савецкай геалагічнай навукі, пісьменнікамі, роднымі і блізкімі.

На адкрыццё выставы запрошаны сын вучонага акадэмік Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі, дзеячы навукі, культуры і мастацтва, сябры, калегі, вучні і землякі.

**Віктар СВЯКЛА, Алена ДЗЕНІСЕНКА,**
**навуковыя супрацоўнікі ЦБС**